# Конкурс заўсёды чакае адкрыццяў

## Улік асаблівасцяў конкурснага ўрока як умова забеспячэння яго эфектыўнасці і эфектнасці

Артыкул адрасаваны будучым удзельнікам конкурсу «Настаўнік года», а таксама намеснікам дырэктараў устаноў адукацыі і метадыстам, якія будуць выконваць ролю кансультантаў для канкурсантаў.

**Мікалай Іванавіч ЗАПРУДСКІ,**
прафесар кафедры педагогікі і менеджменту адукацыі Акадэміі паслядыпломнай адукацыі



Адразу заўважым, што рашэнне настаўніка узяць удзел у конкурсе — важны крок, які можа стаць стартам для новага этапу ў прафесійнай дзейнасці. Менавіта пасля конкурсу і дзякуючы яму настаўнікі паспяхова робяць кар'еру — гарызантальную (істотна павышаюць прафесіяналізм, становяцца настаўнікамі-метадыстамі) або вертыкальную (займаюць пасады дырэктараў школ і гімназій, іх намеснікаў; кіраўнікоў, метадыстаў або выкладчыкаў ІРА і пад.).

*Эфектыўны* — той, што забяспечвае дасягненне мэты (чаканых вынікаў), які дае максімальна магчымы пры дадзеных умовах адукацыйны вынік. Бясспрэчна, урок павінен быць эфектыўным. Такімі самымі павінны быць і кіраўнічая дзейнасць настаўніка, і спазнавальная дзейнасць вучняў. Эфектыўным павінен быць і час урока: ЭЧУ = x/45, тобок x (актыўнасць вучняў) павінна імкнуцца да 45.

*Эфектны* — відовішчны, які стварае моцнае ўражанне. Калі ўрок пабудаваны на ўражлівых, узрушальных эфектах (прыёмах, сітуацыях), а на іх правядзенне выдаткоўваецца значная колькасць часу, то эфектыўнасць дзейнасці настаўніка і вучняў будзе зніжацца. Зразумела, што ў той жа час многія яркія знаходкі настаўніка спрыяюць павышэнню спазнавальнай матывацыі вучняў. Калі ў настаўніка яны ёсць, то ён становіцца для журы заўважаным, бо праяўляе творчую індывідуальнасць, без чаго нельга перамагчы ў конкурсе. Перад канкурсантам стаіць складаная задача — знайсці баланс паміж эфектыўнасцю і эфектнасцю. Менавіта ва ўменні знайсці гэты баланс будзе праяўляцца ваш прафесіяналізм.

Урок — сістэма, якая ўключае дзейнасць настаўніка і вучняў, мэтавы кампанент, змест, працэс навучання, кантролю і ацэнкі, які рэалізуецца выбранымі настаўнікам формамі, метадамі і сродкамі. У эфектыўным уроку гэтыя кампаненты знаходзяцца ва ўзаемасувязі і ўзаемнай залежнасці. Напрыклад, выбар сродкаў навучання залежыць і ад мэты, і ад зместу, і ад таго, ці ўмеюць вучні пра-

**ЧИТАЙТЕ В СВЕЖЕМ НОМЕРЕ «ОМ»**